6. Синегрибов Иван Прохорович [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1003462351&tab=navDetailManCard. – Дата доступа: 04.11.2023.
7. Синегрибов Михаил Фролович [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1003462364&tab=navDetailManCard. – Дата доступа: 04.11.2023.
8. Королёв Никифор Михайлович [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1271881861&tab=navDetailManCard. – Дата доступа: 05.11.2023.
9. Клименков Фёдор Михеевич [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1504042929&tab=nav DetailManCard. – Дата доступа: 05.11.2023.
10. Синегрибов Тимофей Иольевич [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1003462383&tab=navDetailManCard. – Дата доступа: 05.112023.
11. Бондарев Иван Власович [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1005578109&tab=navDetailManCard. – Дата доступа: 06.11.2023.
12. Бондарев Митрофан Маркович [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1005583302&tab=nav DetailManCard. – Дата доступа: 04.11.2023.
13. Голофаев Иван Евстигнеевич [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=39619087&tab=navDetailManAward. – Дата доступа: 07.11.2023.
14. Козин Сазон Сергеевич [Электронный ресурс] // Подвиг народа 1941–1945. – Режим доступа: https://podvignaroda.ru/?#id=1270984627&tab=navDetailManCard. – Дата доступа: 08.11.2023.

***А. П. Пятроў-Рудакоўскі,***
*канд. экан. навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры «Мытная справа»,*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту»,*
*(г. Гомель, Рэспубліка Беларусь)*

# ПРАБЛЕМЫ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ «МАЛАДЫХ» НАЦЫЙ І НОВЫХ ДЗЯРЖАВАЎ УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ

Перш за ўсё неабходна дакладна акрэсліць, у якім сэнсе ўзята ў дадзеным кантэксце паняцце «Усходняя Еўропа». Сёння ёсць геаграфічнае і палітычнае вызначэнне межаў усходняй Еўропы. З геагра-

фічнага пункту гледжання сюды можна аднесці Беларусь, Балгарыю, Чэхію, Славакію, Венгрыю, Польшу, Малдову, Румынію, Украіну, еўрапейскую частку Расійскай Федэрацыі [1], [2]. Падыход з палітычных і геапалітычных пазіцый дазваляе пашырыць межы гэтага рэгіёну за кошт рэспублік былой Югаславіі, Албаніі, Літвы, Латвіі і Эстоніі, якія гэтак жа, як і вышэйазначаныя краіны, з'яўляліся часткай сацыялістычнага блоку і таму мелі падобныя (хаця і з некаторымі асаблівасцямі) гістарычныя і эканамічныя перадумовы свайго развіцця. Падыход з палітычных пазіцый уяўляецца найбольш мэтазгодным таму, што менавіта ён адлюстроўвае праблемы самаідэнтыфікацыі народаў у тых умовах, калі у постсавецкі час ім прыйшлося рабіць геапалітычны выбар на карысць ці то заходняй, ці то ўсходняй цывілізацыі.

Другі момант, які патрабуе папярэдняга тлумачэння – гэта сутнасць паняццяў «нацыя», «нацыянальнасць», «этнас». Першаснай і абъектыўнай характарыстакай кожнага чалавека, якую дагэтуль патрабуе соцыум, у якім знаходзіцца гэты чалавек – ягоная этнічная прыналежнасць. Гэта значыць, што этнас вызначаецца сукупнасцю фізічных, знешніх характарыстык, паводзінаў, метадаў вядзення гаспадаркі, агульным паходжаннем і вызначэнне самога сябе як носьбіта гэтых уласцівасцяў. Як толькі замоцоўваецца самасвядомасць, непазбежна з'яўляецца канкрэтнае найменне этнасу, што дазваляе канкрэтызаваць гэтае паняцце ў параўнанні з больш нейтральным паняццем «народ». Што датычыць паняцця «нацыянальнасць», то адзначым, што у савецкай гуманітарнай навуцы яно з'яўлялася сінонімам паняцця «этнас», з той розніцай, што пра этнас часцей казалі ў сацыяльна-культурным кантэксце, а пра нацыянальнасць – у кантэксце прававым. У еўрапейскіх жа мовах пад нацыянальнасцю разумеюць дзяржаўную прыналежнасць – тое, што у постсавецкіх краінах называецца грамадзянствам. Нацыя – гэта завяршаючы ўзровень фармавання этнічнай супольнасці ці агульнай супольнасці блізкароднасных этнасаў, якія хоць і акрэсліваюць свае культурныя, моўныя, рэлігійныя асабівасці, але азначаюць сваю прыналежнасць да агульнай супольнасці. Пры гэтым вышэйшай формай існавання нацыі трэба прызнаць нацыянальную дзяржаву. Тыя нацыі, якія не здолелі яе стварыць, маюць высокую рызыку назаўсёды згубіцца, асабліва ў сённяшіх умовах глабалізацыі эканомікі, сацыяльнай сферы і грамадскага жыцця. Аднак былі і ёсць прыклады, калі нацыі, не маючы ўласнай дзяржавы, здолелі захавацца, адрадзіць мову, культуру, нацыянальную памяць. Гэтым прыкладам на сёння

з'яўляюцца яўрэі (яны здолелі адрадзіць сваю нацыянальную дзяржаву, якая была страчана на доўгія стагоддзі), курды, баскі, каталонцы і інш. Значным момантам тут з'яўляецца тое, што ў адных нацый дзяржава ўжо існавала і іхняя гістарычная памяць не згубіла гэты факт, у іншых хоць і не было дзяржавы, аднак ёсць вялікая колькасць насельніцтва, якое захоўвае і больш эфектыўна распаўсюджвае геаграфічна прыкметы сваёй нацыі.

У якасці вырашальных у справе самаідэнтыфікацыі народа можна вызначыць, на наш погляд, тры фактары:

– гістарычны (у межах яго найбольш значнай з'яўляецца гісторыя дзяржаўнасці);

– геаграфічны (ён характарызуецца наяўнасцю вызначанай тэрыторыі, устойлівасцю межаў, наяўнасцю ці адсутнасцю тэрытарыяльных прэтэнзій з боку суседніх краінаў);

– лінгвістычны (ён вызначаецца наяўнасцю і ўстойлівасцю ці ўразлівасцю нацыянальнай мовы);

Прааналізуем гэтыя фактары больш падрабязна. Гістарыяграфія ўсялякай нацыі і дзяржавы скіравана на тое так каб адшукаць і навукова абгрунтаваць свае як мага глыбейшыя гістарычныя карані, бо чым старэйшая нацыя, тым большую павагу яна мае сярод іншых народаў і тым больш аргументаў прыводзіцца не толькі на карысць таго, каб яна захавалася, але і каб мела дамінуючы стан сярод суседзяў. Таму, чым мацней абгрунтавана гістарычнасць нацыі, тым мацней самасвядомасць яе народа, якая базуецца на гонары за тое, што ўдалася вытрываць усе гістарычныя выпрабаванні і захавацца. Значна павышае самасвядомасць факт наяўнасці сваёй уласнай дзяржавы, дзякуючы чаму павышаюцца шанцы нацыі на захаванне і развіццё. Таксама гэта дапамагае перайсці ад нацыянальнай самасвядомасці да нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, таму што маючы сваю незалежную дзяржаву нашмат лягчэй ідэнтыфікаваць сваю прыналежнасць. Трэба адзначыць, што ў гістарычным аспекце фармавання самаідэнтыфікацыі кожнай нацыі значнае месца займае некая падзея, працэс або гераічная і легендарная постаць, што дае штуршок да разумення сваёй адметнасці, або сваёй ролі у сусветнай гісторыі. Напрыклад, у Венгрыі такой значнай падзеяй лічыцца «здабыццё» радзімы, тысячагоддзе якога нядаўна адзначалася, Літва абгрунтоўвае сваю гістарычную веліч тым, што была заснавальніцай магутнай сярэдневечнай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага, Македонія сучасная абгрунтоўвае гістарычную сувязь з Македоніяй старажытнай, Балгарыя ганарыцца тым, што за пяць стагоддзяў асманскага іга не згубіла сваю ідэнтычнасць, здолела іга скінуць і адрадзіць сваю старажытную

дзяржаву. Часта не бярэцца пад увагу той факт, што цягам стагоддзяў змяняліся і зрушваліся межы, мяняўся этнічны склад насельніцтва адпаведных тэрыторый і сённяшняе найменне дзяржавы можа зусім не адпавядаць таму, што пад ім разумелася ў старажытныя часы. Але захаванасць назвы дзяржавы ці мясцовасці ад старажытных да сённяшніх часоў дае падставы насельніцтву ідэнтыфікаваць сябе як нацыю з магутным гістарычным падмуркам.

З вышэйзгаданага вынікае дзеянне другога фактара – геаграфічнага. Калі існуе дзяржава – абавязкова існуе тэрыторыя, якую яна займае, ці займала, але гісторыя нам кажа, што не бывае адвечных межаў. Ёсць асобныя прыклады, калі захавалася не толькі гістарычная дзяржава, але і яе геаграфічная тэрыторыя. Гэта магчыма, калі геаграфічныя ўмовы не спрыялі нашэсцям варожых дзяржаваў. З такіх прыкладаў ва Ўсходняй Еўропе можна ўзгадаць Венгрыю, але толькі ў межах аднаго тысячагоддзя – з таго часу як качуючыя ўгорскія плямёны «займелі» радзіму на зямлі, якая са старажытнарымскіх часоў была вядомая як Панонія. Але, праз стагоддзі Венгрыя, не губляючы сваёй тэрыторыі, вымушана была ўліцца ў Аўстра-Венгерскую імперыю. У іншых выпадках геаграфічныя межы краінаў Усходняй Еўропы можна лічыць не стабільнымі. А гэта абумоўлівае наяўнасць тэрытарыяльных прэтэнзій адных краінаў да іншых. Сёння мы бачым, што такія прэтэнзіі могуць мець схаваны да пэўнага часу характар. Але пры пэўных абставінах і праз стагоддзі яны могуць актуалізавацца на падставе пануючых ідэяў аднаўлення гістарычных межаў. Гэткія прыклады зусім нядаўна можна было бачыць на тэрыторыях краінаў былой Югаславіі (а пытанне па Сербіі і Косава застаецца актуальным і па сёння), нярэдка згадваюць аб тэрытарыяльных прэтэнзіях Венгрыі да Украіны. А на прыкладзе ўзаемаадносінаў Паўночнай Македоніі і Грэцыі адначасова можна вылучыць і геаграфічныя, і гістарычныя супярэчнасці, якія можна ахарактарызаваць як спаборніцтва за гістарычную назву «Македонія» і тыя землі, што калісьці ёй належалі. Такім чынам, наяўнасць сваёй тэрыторыі, непарушнасць і ўстойлівасць межаў у звязку з іх гістарычным абгрунтаваннем, даюць магчымасць самаідэнтыфікавацца нацыі з фізічнай прывязкай да тэрыторыі, што павышае яе шанцы захавацца, калі ёсць магчымасць сваю тэрыторыю абараніць.

Трэці фактар – лінгвістычны – больш складаны для аналізу. Наяўнасць сваёй мовы дазваляе адназначна ідэнтыфікаваць нацыю і сцвярджаць, што яна існуе нават без наяўнасці дзяржавы (найбольш яскравы прыклад – цыганскі народ, таксама можа быць згаданы

прыклад яўрэйскага народу до часу стварэння Дзяржавы Ізраіль, але ён менш падыходзіць, бо існаванне яўрэйскай нацыі было падмацавана наянасцю вельмі доўгай гісторыі і старажытнай дзяр-жавы). Пры гэтым адсутнасць нацыянальнай мовы, ці, пры яе наяўнасці – абмежаванае яе выкарыстанне сёння не сведчаць аб адсутнасці нацыі і недастатковай яе самаідэнтыфікацыі. Прыклад трох заходнееўрапейскіх дзяржаваў: Аўстрыі, Бельгіі, Швейцарыі, якія не маюць уласных тытульных моваў, дэманструе, што федэратыўная дзяржава без адзінай агульнай мовы можа стаць калыскай для фармавання новай нацыі, канешне, калі для таго ёсць гістарычны базіс і геаграфічная ўстойлівасць дзяржаваў. Спроба стварыць новую нацыю у падобным сэнсе адбывалася і ў Савецкім Саюзе, але з той розніцай што дамінуючай была руская мова, як мова дзяржавы-стваральніцы СССР, пры тым, што кожная з саюзных рэспублік мела свае нацыянальныя мовы, ступень ужывання якіх у побыце ў кожнай рэспубліцы была рознай. Але тут моўны фактар адыграў сваю важную ролю у фармаванні самаідэнтычнасці народаў маладых пастсавецкіх дзяржаваў. Прыклад Чэхіі і Балгарыі паказвае, што страта незалежнасці дзяржавы можа прывесці к заняпаду мовы, але калі яна мае дастаткова глыбокія гістарычныя карані, яна можа хутка адрадзіцца пры аднаўленні дзяржаўнасці. Тут варта вылучыць адну праблему, якую можна лічыць актуальнай для ўсіх краінаў Усходняй Еўропы пасля распаду сацыялістычнага блоку. Гэтай праблемай з’яўляецца залішняя англізацыя грамадскага жыцця і культурнага асяроддзя гэтых краінаў. Гэта значыць, што у адпаведнасці са сваім геапалітычным выбарам дзяржавы дапускаюць у паўсядзённы ўжытак усё больш англійскай мовы. Гэтая тэндэнцыя у некаторай меры закранула і Беларусь, дзе ў апошнія годы пры вывучэнні замежных моваў усё большы прыярытэт аддаецца англійскай мове у шкоду французскай, нямецкай, іспанскай. Трэба таксама адзначыць, што тут усё больш запатрабаванай робіцца і кітайская мова. А гэта значыць, што моўная, а услед за ёй і культурная глабалізацыя могуць размыць нацыянальныя межы і стварыць негатыўны ўплыў на самаідэнтыфікацыю нацый і выніку – прынесці пагрозу іх існаванню.

Важна адзначыць, што працэс канчатковага фармавання нацый у асноўным скончыўся у пачатку 20 стагоддзя на базе гістарычныга, геаграфічныга, лінгвістычнага падмурку, хаця дзесьці ён яшчэ працягваецца. Нацыі Ўсходняй Еўропы – гэта ўвогуле нацыі старыя, якія маюць глыбокія гістарычныя карані, але дзяржавы, якія імі створаны, адносна маладыя. У сучасным выглядзе яны з’явіліся пасля першай і другой сусветных войнаў, але некаторыя з іх той ці іншы досвед дзяржаўнасці

ужо мелі, нават калі гэтым досведам лічыць знаходжанне ў федэратыўнах утварэннях (напрыклад, Сацыялістычная Федэратыўная Рэспубліка Югаславія) ці імперыях (Аўстра-Венгерская імперыя).

Што датычыць Беларусі, то яе можна лічыць і маладой нацыяй, і маладой дзяржавай, што, на жаль, ускладняе і запавольвае працэсы самаідэнтыфікацыі. Геаграфічная асаблівасць тэрыторыі – знаходжанне на перакрыжаванні важных гандлёвых шляхоў – абумовіла тое, што за гэтыя землі заўсёды ішла барацьба, змяняліся межы дзяржаваў, самі дзяржавы, іхнія назвы. А гэта нярэдка прыводзіла да вялікіх войнаў, якія не абміналі нашу зямлю. Таму адзначым, што на сёння ўзрост нашай краіны як сфармаванай нацыі і дзяржавы са сваім найменнем «Беларусь» адносна невялікі ў параўнанні з многімі ўсходнееўрапейскімі суседзямі і складае каля аднаго стагоддзя. Гэта ўразлівая пазіцыя, таму што суседнія краіны з больш глыбокімі гістарычнымі каранямі будуць імкнуцца даказаць гістарычную недарэчнасць існавання маладой дзяржавы, калі яшчэ нядаўна на гэтай зямлі яе не было. Пасылаючы такія сігналы рознымі спосабамі інфармацыйнага ўздзеяння на насельніцтва, яны могуць нанесці шкоду працэсам фармавання самаідэнтыфікацыі нацыі. Таму галоўная задача для кожнай маладой нацыі і дзяржавы заключаецца ў тым, каб надаваць належную ўвагу сваёй гістарычнай навуцы з мэтай дакладнага вывучэння гісторыі дзяржаўнасці сваёй нацыі ў розных яе гістарычных формах, захаванне і пашырэнне такой інфармацыі ў тым ліку і за межамі краіны.

Што датычыць трэцяга фактара самаідэнтыфікацыі нацыі – лінгвістычнага, то тут адзначым, што, як ні дзіўна, па гэтым фактары Беларусь мае досыць моцныя пазіцыі, хаця мова і не прадстаўлена ў шырокім ужытку. Справа ў тым, што гісторыя мовы любога народа значна больш доўгая за гісторыю ягонай дзяржавы, і калі яна існуе ў пісьмовым выглядзе – гэта з’яўляецца непасрэдным задакументаваным доказам існавання народа, выступае адной з перадумоваў фармавання нацыі і дазваляе пазначыць сваё месца паміж іншымі народамі. Адзначым, што мовы практычна ўсіх народаў Усходняй Еўропы з’явіліся раней, чым дзяржавы, і Беларусь тут не выключэнне.

У якасці высновы неабодна адзначыць, што самаідэнтыфікацыя народа – гэта абавязковая ўмова як для ўстойлівасці і развіцця нацыі ў сённяшніх зменлівых абставінах, так і для забеспячэння бяспекі дзяржавы. Пагрозы, скіраваныя на разбурэнне дзяржавы ў якасці абавязковай задачы будуць мець аслабленне матываў самаідэнтыфікацыі нацыі. І напрамкі ўздзеяння ў гэтым выпадку адпавядаюць тром вышэйпрааналізаваным фактарам. Яно праяўляецца ў перапісванні і

перайначванні гісторыі не толькі сваёй, але і суседзяў; у абгрунтаванні і спробах перагляду межаў; у яўнай ці схаванай моўнай экспансіі.

Краіны Усходняй Еўропы, знаходзячыся ў атачэнні больш магутных дзяржаваў, а таксама, ва ўмовах глабалізацыі, якая знішчае дзяржаўнае межы і рашчыняе нацыянальную ідэнтычнасць, павінны спрыяць разуменню важнасці нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, каб нацыі не зніклі.

## Спіс крыніц і літаратуры


1. Statistical Yearbook 2023 (Статыстычны штогоднік ААН 2023) [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://unstats.un.org/UNSDWebsite/Publications/StatisticalYearbook/syb66.pdf. – Дата доступа: 24.10.2023.
2. The Diplomatic Service of the European Union (Дыпламатычная служба Еўрапейскага Саюза) [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа: https://www.eeas.europa.eu/eeas/eastern-europe_en#12226. – Дата доступа: 24.10.2023.



***Ю. Н. Дрозд,***
*д-р теологии,*
*ксёндз, приход Рождества Божьей Матери*
*(г. Гомель, Республика Беларусь)*


# ИСТОРИЧЕСКИЙ ПУТЬ РАЗВИТИЯ ПИНСКОЙ ДИОЦЕЗИИ

Римско-католическая церковь присутствует на конфессиональной карте Республики Беларусь как один из её важнейших элементов. Она приумножает духовную и материальную культуру нашей страны, вносит свой вклад в сохранение традиционных ценностей и духовных основ жизни общества. Эта работа всегда осуществляется на уровне отдельно взятых административных единиц. Таковыми, согласно каноническому праву, прежде всего являются диоцезы (уместен также термин «диоцезии»). Из их совокупности главным образом и состоит Католическая церковь [1, кан. 368].

Органичной частью Римско-католической церкви в Беларуси является Пинская диоцезия, охватывающая ныне границы Брестской и